УЗМАЦНІЦЬ РАБОТУ СА СПАЧУВАЮЧЫМІ

Для арганізацыі вакол нашай партыі лепшага беспартыйнага актыва, які на справе даказаў сваю адданасць соцыялістычнаму будаўніцтву, але які яшчэ не падрыхтаван да паступлення ў партыю,— пры партарганізацыях створаны групы спачуваючых.

У нашай партарганізацыі група спачуваючых складаецца з 14 чалавек. Гэта ў большасці лепшыя выкладчыкі (Жукаў, Крук, Мацісава, Карповіч), аспірэнты і студэнты.

Трэба адзначыць, што для ўцягнення ў спачуваючыя лепшых беспартыйных студэнтаў нашымі партгрупамі амаль нічога не робіцца. Напрыклад, на біяфаку ёсць толькі адзін спачуваючы, па гістфаку таксама адзін.

Парторгі груп не цікавяцца работай са спачуваючымі. Калі апошнім і даручаецца якая-небудзь грамадская работа, то праверкі выканання з боку парторгаў няма. Парторг гістфака Севасцянчык ні разу не пацікавіўся, як працуе спачуваючая Пассэ. Парторг хімфака Шыфрына не цікавіцца, як спачуваючыя наведваюць палітзаняткі, як яны павышаюць свой ідэйна-палітычны ўзровень. Спачуваючы Навумаў (біяфак) за апошні час зусім перастаў наведваць групавыя заняткі, аднак парторг Гантман ні разу не напомніла яму аб гэтым. Трэба адзначыць, што і самі спачуваючыя прымаюць слабы ўдзел у нашым грамадскім жыцці.

Партком БДУ прыняў пэўныя меры да ажыўлення работы са спачуваючымі: заслуханы самасправаздачы, арганізаван палітгурток. Але гэтага яшчэ мала. Трэба паставіць пытанне перад кожным парторгам факультэта, каб ён больш звяртаў увагі на спачуваючых, уцягваў іх у актыўную грамадскую работу, даваў ім асобныя даручэнні і правяраў іх выкананне. Словам, трэба больш увагі звярнуць на ўцягненне лепшых навуковых работнікаў і студэнтаў у групы спачуваючых. Аб адсутнасці такой работы гаворыць той факт, што за гэты год мы атрымалі толькі адну заяву аб прыняцці ў спачуваючыя.

ГЕЛЬФАНД.

За горад, у парк, на раку

Цяпер, калі цяпляюць дні, калі праменні сонца прыпякаюць усе мацней і мацней, калі зеляненюць дрэвы і квітнеюць сады хочацца паехаць у дзень адпачынку за горад, у парк, на раку...

Мы павінны вітаць добры пачын комсамольскай арганізацыі хімфака, якая выконваючы рашэнні X з'езда ВЛКСМ 12 мая арганізавала масоўку ў парку культуры. У сасновым лесе іграў гармонік, быў у ходу патэфон, футбольны мяч... Хімфакаўцы спявалі, танцавалі, культурна адпачывалі.

Вельмі добры пачын комсамольцаў хімфака трэба падхапіць усім нашым комсамольскім групам, арганізаваць студэнцкую моладзь на вясёлы, культурны адпачынак, наладзіць кожны выходны дзень масавыя паходы за горад, у парк, на раку.

ГУРЫНОВІЧ.

Група планерыстаў гістфака.

ВЕЧАР ЗАМЕЖНЫХ МОЎ

Студэнты збіраюцца на вечар замежных моў. На карыдоры, у зале, усюды дзе гулялі, дзе сядзелі студэнты, чуваць гукі нямецкай, французскай і англійскай мовы.

Пачаўся вечар. Яго адкрыў на нямецкай мове старшыня мопраўскай арганізацыі універсітэта тав. Ротман. Дакладчык — студэнт II курса гістфака тав. Токар — гаварыў па-нямецку свабодна і ўпэўнена, нібы сапраўдны немец. Студэнты горача апладзіравалі, калі ён упамінаў кіраўнікоў партыі і ўрада, упамінаў таварыша Сталіна і правадыра германскага пролетарыята таварыша Тэльмана.

Таксама ўдала гаварыў на англійскай мове студэнт хімфака Васьковіч. Калектыўны хор гістфака пад кіраўніцтвам выкладчыцы Шарамецеўскай вельмі добра выканаў песню па французскай мове.

Выключна цікава прайшла мастацкая частка. Студэнты хімфака эмоцыянальна і весела праспявалі «Калгасныя песні» і «Браты, да сонца і волі» — на нямецкай мове. Фізматавец Каган прадэкламаваў верш Гейне «Ткачы». Цікавым было выступленне тав. Шкляеван. Яно насіла жывую, вясёлую гутарку са студэнтамі залы.

Інтэрнацыянальны вечар прайшоў жыва і цікава.

ЛЕВАНОВІЧ.

Фантан на скверы універсітэцкага гарадка.

Справаздачна-перавыбарчая кампанія Асоавіяхіма

Згодна пастановы Цэнтральнага Совета Асоавіяхіма, ў першыя з красавіка па ліпень будуць праведзены справаздачы і перавыбары ўсіх звенняў арганізацыі АСО. У Менску, ў тым ліку і ва ўніверсітэце, перавыбары павінны закончыцца ў маі.

Падрыхтоўка да перавыбараў пачана замацаваць праведзеную на аэмену асоавіяхімаўскіх білетаў работу і пакласці канец арганізацыйнай запушчанасці. Пабаявому праведзеная справаздачна-перавыбарчая кампанія павінна адыграць выключную ролю ў справе арганізацыйнага ўмацавання нашага Асоавіяхіма.

Абмен білетаў АСО у нас быў фактычна зведзен да простай тэхнічнай справы. У выніку абмену мы не ўмацавалі арганізацыі і на сённяшні дзень яна не мае свайго пэўнага твару.

Перавыбары павінны ўзняць на новую, больш высокую ступень усю практычную абаронную работу і ліквідаваць ўсе недахопы ў гэтай справе.

Трэба сказаць, што значная колькасць студэнтаў індывідуальна здала нормы ПВХО, а ўніверсітэт у цэлым мы не можам лічыць люўнасцю падрыхтаваным да ПВХО; няма амаль ніякіх інструментаў, вопраткі і матэрыялаў, патрэбных для процпаветранай хімічнай абароны.

Работа з «варашылаўскімі стралкамі» вядзецца толькі ў часе іх падрыхтоўкі, а пасля ніякай сістэматычнай трэніроўкі не праводзіцца, і рад студэнтаў, здаўшых нормы, на сёння нельга назваць «варашылаўскімі стралкамі», бо яны страляюць выключна дрэнна.

Групы самаабароны яшчэ далека не падрыхтаваны так, каб яны сапраўды адпавядалі свайму назначэнню.

Падбор кіраўнікоў у ваенных гуртках быў з рук вон дрэнны. У выніку асталися толькі гурткі па падрыхтоўцы санітараў, планерыстаў і бягучая работа па падрыхтоўцы «варашылаўскіх стралкоў» і здачы норм ПВХО.

На ўсе гэтыя вузкія месцы ваеннай работы ў часе справаздачна-перавыбарчай кампаніі асоавіяхімаўскай арганізацыі трэба звярнуць выключную ўвагу.

БУЯКОЎ.

ЗАЖЫМШЧЫКІ САМАКРЫТЫКІ

У рэдкалегію групавой газеты «Ленінец» (III курс фізікаў) паступіла заметка аб недысцыплінаванасці некаторых студэнтаў, аб тым, што наогул на курсе вельмі дрэнна з дысцыплінай, што няма таго дня, каб студэнты не прапускалі лекцый. Студэнт Эсмантовіч, напрыклад, прапусціў 15 гадзін. Рэдактар газеты тав. Хейфец, замест таго, каб змясціць гэту заметку і рэагаваць на яе, перадае змест апошняй і прозвішча аўтара Эсмантовічу. Вядома, Эсмантовіч абурыўся на аўтара заметкі і пачаў яму даказваць: «Крытыкуй усіх, толькі не мяне».

І так, прагулы растуць, дысцыпліна на курсе адсутнічае, а Хейфец разгортвае самакрытыку па-свойму.

...ЗАКАНЧВАЮЧЫЯ ВНУ І ВТНУ Ў 1937 ГОДЗЕ ПАВІННЫ ЯК ПРАВІЛА, ПОЎНАСЦЮ ЗДАЦЬ НОРМЫ ГПА ДРУГОЙ СТУПЕНІ...

...ЗАДАЧА СОВЕЦКІХ СПАРТСМЕНАЎ — ВУЧЫЦЦА ВЫСОКАЙ ТЭХНІЦЫ СПОРТУ, АВАЛОДВАЦЬ ТЭХНІКАЙ ПЕРАМОГІ.

А. КОСАРЭЎ.

„НОВАЕ Ў ФІЗКУЛЬТУРЫ"

Прышла вясна, і наш малады сквер стаў непазнавальны, а фантан—проста срэбрам на сонца ззяе. Кожны перапынак на пясчаных сцежачках гуляюць студэнты. Усе такія радасныя, вясёлыя, шчаслівыя, іх загарэлыя твары дышуць здароўем.

Гуляюць студэнты на скверы ў вольны час, і нярэдка пачуеш ад іх: «У валейбол-бы пагуляць... у у футбол...» Або: «Добра раніцою пасля сна на турніку ды на брусях папрацаваць... у выходны дзень за горад на рэчку з'ездзіць-бы, пакупацца...»

На вялікі жаль, гэтыя скромныя жаданні зусім не задавальняюцца. Ні каля аднаго інтэрната няма ні фізкультурнай пляцоўкі, ні мяча валейбольнага, ні сеткі, ні турніка, ні бруссяў. Нездарма аднойчы, сядзячы на лавачцы нашага скверу, я пачуў гутарку студэнтаў.

— Ведаеце, што надумаў я хлопцы?—сказаў Арон, акінуўшы вачыма старыя дрэвы з абрэзанымі макушкамі.

Новае ў фізкультуры: замест турніка, хлопцы гоцаюць на дрэвах.

— Ну, што?—запыталіся таварышы.

— А вось, што. У нас, каля інтэрната на Студэнцкай і каля галоўнага корпуса няма турнікоў і бруссяў. Я ўношу прапанову нашаму бюро фізкультуры і асабіста т. Косару. Замест турніка пасадзіць над вокнамі інтэрната вось такія дрэвы і глядзі на суччах можна будзе «спінкі» і «скобкі» рабіць.

— Га-га-га.—зарагаталі хлопцы.

— І, сапраўды добрая справа,— пачуўся з агульнага рогату звонкі голас Васі.

— А я вось прыдумала,—загаварыла Каця—любіцельніца валейбола,—у нас няма ў інтэрнаце мяча, набыць некалькі падушак і прэсцынь. Прэсцынь нацягнем паміж двух слупоў і будзем праз іх падушкі кідаць.

Смяючыся яны пашлі далей і я не пачуў больш прапаноў нашым кіруючым арганізацыям. Але досыць гэтага. Жартлівая гутарка студэнтаў была выкліканая сур'ёзнай справай. Прафкому і камітэту комсамола трэба звярнуць увагу на арганізацыю фізкультуры студэнтаў і самае галоўнае набыць неабходны фізкультурны інвентар.

Е. ГЕРАСІМАЎ.

Каменданты нядбайна адносяцца да сваіх абавязкаў

Калі заходзіш у 202, 203, 204 аўдыторыі біякорпуса, то першае, што кідаецца ў вочы — гэта паломаныя крэслы, брудныя вокны, нявызначанага колеру сталы, пакрытыя тоўстым слоем пылу. Сцены затканы павуцінай і ззяюць дзесяткамі прабоін (камендант корпуса Папковіч).

Не лепшы выгляд маюць аўдыторыі 28,32, 36 у хімічным корпусе (каменданта (Папковіч), Вельмі рэдка заглядваюць прыбіральшчыцы ў аудыторыі 1, 15, 16, 22 фізкорпуса (камендант Мотус).

Каменданты карпусоў не лічаць сваім абавязкам сачыць за чыстатой і парадкам у аўдыторыях. Яны задавальняюцца тым, што некалькі раз праходзяць па карыдорах. Большасць аудыторый не маюць замкоў і ключоў, асабліва ў біякорпусе.

Нядбайна адносяцца да сваіх абавязкаў і некаторыя каменданты інтэрнатаў. Напрыклад, у 52 бараку (камендант Забаўскі) амаль ніколі няма вады, чайнікаў па аднаму на два пакоі, студэнты часта прымушаны ісці на заняткі няўмытымі і без чаю. Асвятленне вельмі дрэннае, і чытаць часта зусім немагчыма. У радзе пакояў няма палавікоў, занавесак, графінаў.

У інтэрнаце галоўнага корпуса каменданты мяняюцца кожны месяц (цяпер камендант Мотус), а за парадкам і чыстатою ні адзін не сочыць. Вельмі часта па некалькі дзён не ўбіраюцца карыдоры. Інтэрнат і ў дзень і ў ночы адкрыт. Ён ператвараецца ў праходны двор для ўсяго ўніверсітэцкага гарадка.

(З матэрыялаў лёгкай кавалерыі).

АД РЭДАКЦЫІ: Змяшчаючы Матэрыял аб нядбайных адносінах каменданта ў інтэрнатаў і корпуса да сваіх абавязкаў, рэдакцыя чакае неадкладнага рэагавання ад гаспадарчай часткі БДУ.

Буфет працуе дрэнна

На перапынках у буфеце заўсёды поўна студэнтаў, але шчасліўцаў, якія могуць купіць шклянку малака ці што-небудзь іншае з прадуктаў, не больш 10—15 чалавек.

У чым справа? Чаму буфет не можа абслужыць усіх студэнтаў? Уся бяда ў тым, што работніцы буфета (Данілевіч і Ждановіч) вельмі непаваротлівы, сваёй работы не арганізавалі.

Чаму-б, напрыклад, загадзя не падрыхтаваць порцыямі хлеб, каўбасу, сыр і інш. Часу па гэта хватае, бо ў часе лекцый у буфеце ні аднаго студэнта не бывае.

У буфеце адсутнічаюць такія прылады, як нажы, лыжкі, зусім мала стаканаў, амаль ніколі не бывае солі. Бываюць частыя выпадкі, што прадаюцца нядобраякасныя прадукты (скіслае малако — за свежае).

Нельга абмінуць і таго факту, што ў нашым буфеце ніколі не бывае тапных папірос, у большасці прадаюцца трохрублёвыя. Таксама рэдка калі бывае сітро, а попыт на яго вялікі.

Невядома з якой прычыны нядаўна буфет перавялі ў цесны пакой, дзе заўсёды брудна і душна.

Гаспадарчай часткі БДУ і кіраўніцтву буфетамі фабрыкі-кухні трэба сур'ёзна зацікавіцца работай нашага буфета.

ПЛОТКІН, ІСКІНА.

Чва адк. рэд. МАЛЮКЕВІЧ.

Мінск, друкарня «Звязды» Тыраж 1.000. Горліт 964